## На філалагічным сумежжы

Традыцыя правядзення сёлетняй дзявятай па ліку навуковай канферэнцыі бярэ свой адлік часу яшчэ з канца XX стагоддзя, калі ў кастрычніку 1997 г. адбылася міжнародная навуковая канферэнцыя «Беларуская мова ў другой палове XX стагоддзя», правядзенне якой рэгламентавалася Міжнародным лінгвістычным праектам «Najnowsze dzieje języków słowiańskich», што выконваўся ў Апольскім універсітэце пад кіраўніцтвам Польскай акадэміі навук і пры падтрымцы ЮНЕСКА. Менавіта ў пастанове гэтай канферэнцыі канстатавалася неабходнасць не радзей аднаго разу ў два гады правядзенне навуковых канферэнцый па актуальных праблемах развіцця сучаснай беларускай мовы. Пазней да лінгвістаў далучыліся літаратуразнаўцы, метадысты і культуролагі, а першая частка ў назве канферэнцыі стала залежаць ад профілю кафедры-арганізатара навуковага форуму.

Правядзенне сёлетняй канферэнцыі супала з сумнай навіной аб смерці аднаго з самых слынных лінгвістаў на постсавецкай прасторы – прафесара Арнольда Яфімавіча Міхневіча. Вучні і калегі вучонага вырашылі прысвяціць яе памяці навукоўца. Істотна змяніўся і фармат правядзення самой канферэнцыі, з-за аб'яўленай пандэміі каронавіруснай інфекцыі яна стала вочна-завочнай, частка выступленняў была заслухана ў анлайн-рэжыме. Аднак гэтыя абставіны не перашкодзілі актыўнаму ўдзелу ў яе правядзенні як многім аўтарытэтным даследчыкам праблем філалагічнага сумежжа, так і тым, што толькі спрабуе знайсці сваё месца ў вывучэнні шматаспектных пытанняў лінгвістыкі, літаратуразнаўства і методыкі выкладання філалагічных дысцыплін.

Ад імя аргкамітэта канферэнцыі хачу выказаць асаблівую падзяку прафесару Таццяне Расціславаўне Рамза і дацэнту Юліі Віктараўне Назаранцы за пранікнёнае лірычна-мастацкае афармленне і вядзенне пленарнага пасяджэння, а таксама дацэнту Георгію Чахоўскаму і ст. выкладчыку Аляксандру Радзевічу, дзякуючы якім былі падрыхтаваны камп'ютарная версія і арыгінал-макет гэтага зборніка. Шчыры дзякуй усім, хто спрычыніўся да нашага мерапрыемства, аддаў даніну павагі нашаму навуковаму і жыццёваму Настаўніку Арнольду Яфімавічу Міхневічу.

***Мікалай Прыгодзіч***, загадчык кафедры беларускага мовазнаўства, доктар філалагічных навук, прафесар